УДК 821.161.3

*В. І. Караткевіч* (Магілёў, Беларусь)

# АСАБЛІВАСЦІ ВОБРАЗНАЙ СІСТЭМЫ КАЗАК АЛЕНЫ МАСЛА (на прыкладзе твораў "Споведзь мёртвай ракі", "Крыўда старога вадзяніка" і "Пацучок Фэлік падарожнічае")

*This article deals with specific features of images of fairy tales by Helena Maslo.*

Беларуская літаратурная казка на сучасным этапе свайго існавання мае шэраг спецыфічных асаблівасцяў. Яна бярэ свой пачатак з вуснай народнай творчасці і з літаратурных мастацкіх традыцый папярэдніх перыядаў развіцця літаратуры. Сучасная казка ўтрымлівае ў сабе цікавы сінтэз тэм, ідэй, матываў, асэнсаванне якіх адбываецца праз вобразную сістэму канкрэтных тэкстаў.

У межах адзначаных высноў цікавым уяўляецца аналіз пэўных прыкладаў казачных твораў з мэтай выяўлення іх сэнсавай глыбіні, дыдактычнага і развівальнага патэнцыялу з улікам таго факту, што гутарка ідзе пра творы, прызначаныя для ўспрымання дзецьмі.

У рэчышчы нашага даследавання паказальнымі з'яўляюцца казкі Алены Масла "Споведзь мёртвай ракі", "Крыўда старога Вадзяніка" і "Пацучок Фэлік падарожнічае", дзе выкарыстаны тры розныя пісьменніцкія стратэгіі пры распрацоўцы вобразнай сістэмы.

Першыя з дзвюх названых казак уяўляюцца як прыродазнаўчыя казкі, што маюць на мэце ў казачнай форме пазнаёміць чытача (слухача) з сучаснымі экалагічнымі праблемамі.

Казка "Споведзь мёртвай ракі" – гэта маналог забруджанай ракі, звернуты да чалавека. Твор вызначаецца тым, што ў ім фактычна адна



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дзейная асоба, якая скардзіцца і дакарае за сваю смерць: *"Наіўныя, дурныя мае дзеткі! Столькі мудрых навук вучыце ў сваіх школах, што забываецеся на самае галоўнае. Зямля, на якой жывём мы ўсе, круглая. І нічога, створанае на ёй, не знікае ў прорве за даляглядам. Крынічкі збіраюцца ў рачулкі, тыя жывяць вялікія рэкі, а яны плывуць у моры-акіяны, перамешваючы ўсе стрэчаныя на сваім шляху воды. І не будзе чыстай вады, калі цячэ па зямлі хоць адна мёртвая рака"* [3, с. 66]. Адсутнасць разгалінаванай вобразнай сістэмы дае магчымасць сканцэнтраваць увагу на галоўнай гераіні, думкі якой дастаткова канкрэтныя і, на першы погляд, банальныя, хоць уражваюць сваёй трагічнасцю і безнадзейнасцю.

Казка мае прытчавы характар, тут ёсць філасофскае павучанне, якое адкрывае малым чытачам пэўны закон сусвету: *"Мая вада штодзень бывае ў вашых хатах, праходзіць праз вашыя целы. І больш, чым мазутам ці нафтай, атручваецца яна вашай бяздушнасцю. Мазут і нафта – гэта толькі яе адгалоскі, толькі вынік горкай праўды пра тое, што няма меры вашай штодзённай празе ўзяць ад зямлі як найбольш выгод і багацця, расцягаць па ўласных кватэрах і хатах"* [3, с. 67].

Выкарыстанне аднаго цэнтральнага вобраза – мёртвай ракі – узмацняе эмацыйны эфект, дапамагае ўдумліваму рэцыпіенту ўсвядоміць трагедыю знішчэння навакольнага асяроддзя праз бяздушнасць.

Экалагічнай праблеме прысвечана і казка "Крыўда старога Вадзяніка". Гэты твор таксама мае незвычайную форму – аповед у аповедзе. Заўважым, што гэта адна з прыкмет аўтарскага стылю А. Масла (падобная форма выкарыстана, напрыклад, у казках "Каляды ў хроснай" "Як пані Чаротная на госці ў Палангу бегала", "Вандроўка з божымі кароўкамі").

Сістэма вобразаў у казцы "Крыўда старога Вадзяніка" будуецца па прынцыпе супрацьпастаўлення свету падводных жыхароў і свету людзей. *"Вялізная рыба сом"*, каб дагадзіць свайму гаспадару, выкрадае хлопчыка. Васілёк мусіць дапамагчы старому Вадзяніку вярнуць унучак, ачысціўшы крынічку, якая жывіла рэчку Шнуроўку.

Вадзянік не верыць у чалавечую дабрыню: *"– Чалавека ён прывёў! – сычэў, бо ад болю ў паясніцы грымець ужо не мог, на Сома Вадзянік. – Здурэў на старасці гадоў! Знайшоў памочніка!* ***Ды чалавек апошнім часам самым страшным ворагам возеру стаў!*** [Тут і далей вылучана намі. – *В.К.*]. *Забыўся, як нас тут ледзь не ўсіх атруцілі,* ***з новага камбіната ў ваду хіміі нейкай напусціўшы****? А як нам тут лёгка дыхаецца, калі ўвесну з паводкам* ***з палёў мінеральныя ўгнаенні ў ваду цякуць****? А як электравудамі вас тут штораз глушаць – што, хіба не яны вось, не людзі?!"* [1, с. 99].

Так у казку ўводзяцца сучасныя рэаліі, што не лепшым чынам характарызуюць чалавека. Падводны свет выглядае абсалютна безабаронным, хоць



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

у пачатку казкі ім страшыць Васілька бабуля: *"Не трэба, дзетка, хадзіць на возера аднаму. Там жыве вялізная рыба сом. Дарослага не адужае, а дзіця вусам закрапае – і на дно, на службу старому Вадзяніку"* [1, с. 94].

У падводным свеце дзейнічаюць рэальныя рыбы (напрыклад, сом) і міфалагічныя істоты (Вадзянік і яго ўнучкі). Гэтым самым ствараецца незвычайная атмасфера таямнічасці таго, што адбываецца ў пададзеным уладарстве.

Эфект нечаканасці (Вадзянік не чакае ад чалавека добрага, але сам не шкодзіць чалавеку) узмацняецца рэакцыяй рыб на словы Вадзяніка: *"Расчуленыя прамовай свайго Гаспадара, рыбы заплакалі. Мамкі пахапалі малькоў, сваіх дзетак, і сталі тыкаць плаўнікамі ў бок хлопчыка: маўляў, запамінайце, як чалавек выглядае, і абмінайце яго за вярсту..."* [1, с. 99].

Васілёк насуперак тым злым чаканням, якія ёсць у падводных жыхароў, *"надумаў упрасіць татку сабраць грамаду і адшукаць крынічку, з якой пачынаецца рэчка – вусце расчысціць. Няхай бы ласкатушкі* [унучкі Вадзяніка. – *В.К.*] *вярнуліся ў возера, да дзядулі-Вадзяніка. Няхай бы ён не маркоціўся, **не крыўдаваў на людзей**, не скардзіўся на свій гаротны лёс, а катаўся б шчаслівы на Соме, даглядаў сваё ўладарства!"* [1, с. 100]. Спагадлівы хлопчык вяртае давер да людзей як да істот добрых па сваёй сутнасці, ён прымірае свет людзей і свет жывёл, якія супрацьпастаўляюцца ў пачатку твора.

Заўважым, што маленькі Васілёк не ідэалізуецца. Спачатку ён баіцца таго сама, якім страшыць бабуля, але пераадольвае свой страх. Гэтае пачуццё змяняецца цікаўнасцю: хлопчык мае магчымасць паглядзець на возера з іншага боку. Урэшце цікаўнасць змяняецца шкадаваннем старога Вадзяніка. А. Масла прэзентуе шырокую гаму пачуццяў, што дае магчымасць рэцыпіенту аналізаваць свае адчуванні, параўноўваць, задумвацца над уласнымі ўчынкамі.

Казка "Пацучок Фэлік падарожнічае" будуецца па прынцыпе паралелізму, дзе свет людзей ("верхні свет") існуе паралельна свету пацукоў ("ніжняму свету"). У абодвух светах ёсць страхавыя кампаніі ("Дзяржстрах" і "Супрацькатэ"), "Цырульня" (ёй карыстаюцца людзі і пацукі), кавярні (у людзей гэта кавярня, каля якой стаіць камінар, а ў пацукоў – пані Пацукевіч у падземным калектары адкрыла сваю кавярню – "На галерах") і гандлёвыя цэнтры, інтэрнэт-кавярні для людзей (там Фэлік перагрыз правады і ледзь не ўчыніў пажар). І самае важнае – пацуковыя дамы. У казцы адлюстраваны часовы дом Фэліка ў джыпе і дом, дзе жывуць яго родныя. Апісанне дома ў джыпе дае ўяўленне пра цягу пацучка да камфорту пры любых абставінах і непарыўнай яго сувязі з "радзімай": *"Цёпла, утульненька, дызайн ва ўлюбёным стылі хай-тэк. А самае галоўнае – фотаздымак сям'і на сцяне.*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Мама – буйным планам"* [2, с. 10]. Гэта адпавядае ментальным устаноўкам беларусаў, якія шануюць продкаў і добра прыстасоўваюцца да сітуацыі.

Трэба адзначыць, што "верхні свет" паказаны дастаткова схематычна: людзі не маюць іменаў, усе настроены варожа да пацукоў (камінар не пускае наверх, рамонтнік ледзь не забіў Фэліка). Жыхары ж "ніжняга свету" больш рознапланавыя – гэта прыгажуні Ларыска і Анфіска (*"Вусікі завітыя, пазногцікі нафарбаваныя, поўсць на галаве ў адной – чырвоная, у другой – зялёная. А ў вушах і ў носе – завушнічкі!"* [2, с. 9]), добрая гаспадыня пані Пацукевіч, надакучлівыя прадавачкі, "радзіна" Фэліка, якая сустракае яго як героя, урэшце, сам Фэлік. Гэта звычайны пацучок, які ажыццяўляе сваю мару падарожнічаць па свеце, ён не ідэальны: любіць хваліцца (напрыклад, эпізоды ў кавярні, у краме адзення). Фэлік імкнецца даказаць усім, што ён ужо не маленькі. Але ў самы адказны момант ён, хоць і напалохаўся, але выратаваў сваіх сяброўак: *"Яны* [рамонтнікі. – *В.К.*] ***наваt ухапілі** пацучка **за хвост і балюча прыціснулі яго. Але не на таго напалі!** Фэлік **развярнуўся і цапнуў** зубкамі свайго крыўдзіцеля.*

*Крыўдзіцель войкнуў, адпусціў хвост – і Фэлік **шморгнуў** праз дзюрку ў панелі на зямлю!*

***З радасцю** Фэлік **паспеў адзначыць**, што ані сяброўак, ані торбачак з абновамі ў машыне **ўжо не было** – пасярод пакойчыка толькі сіратліва **валялася** вышываная мамай коўдрачка"* [2, с. 25].

Сам Фэлік мабільны і вясёлы. Цікава адзначыць, што Фэлік нідзе не працаваў і, як вынікае з апошняга раздзела ("Вырашаецца лёс сяброў") не працуе, а толькі з задавальненнем падарожнічае разам са сваёй жонкай Ларыскай. Тыя, хто працуе, не маюць у казцы станоўчых ацэнак. Гэта мае дачыненне як да людзей, так і пацукоў, што дае падставы сцвярджаць пра напоўненасць мастацкай прасторы казкі бесклапотным жыццём, бо пануючым у сучасным грамадстве з'яўляецца геданізм.

У казцы прадстаўлена дастаткова пярэстая карціна жыцця беларускага грамадства ў пэўны прамежак часу. У характэрнай для дзіцячай літаратуры манеры назіраецца некаторая ідэалізацыя рэчаіснасці, такая праява беларускай ментальнасці, як вера ў добрае і станоўчае, а таксама жыццесцвярджальны погляд на жыццёвыя няўдачы, што знаходзіць адлюстраванне на самых розных узроўнях арганізацыі мастацкага тэксту: яго структура, стварэнне вобразнай сістэмы, стыль і г.д.

Такім чынам, у казках Алены Масла выкарыстоўваюцца розныя стратэгіі пабудовы вобразнай сістэмы: маналагізацыя расповеду, супрацьпастаўленне свету жывёл і свету людзей, паралелізацыя гэтых двух светаў.

Мастацкі антураж казак "Споведзь мёртвай ракі", "Крыўда старога Вадзяніка" і "Пацучок Фэлік падарожнічае" ўяўляецца як асобая мадэль



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

асэнсавання рэчаіснасці, пададзеная з розных ідэйных і эстэтычных пазіцый. У гэтых творах спалучаюцца рысы пазнавальнай і маралізатарскай казкі.

Разам з тым прааналізаваныя сістэмы вобразаў уяўляюцца своеасаблівай матрыцай традыцыйнай іерархіі маральна-этычных каштоўнасцяў усходніх славян.

**Літаратура:**


1. *Масла, А.* Крыўда старога Вадзяніка / А. Масла // Блакітная кніга ў творах беларускіх пісьменнікаў / уклад. А. Масла. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2009. – С. 94-100.
2. *Масла, А.* Пацучок Фэлік падарожнічае : казка / А. Масла. – Мінск : Выдавецкі дом "Звязда", 2013. – 32 с.
3. *Масла, А.* Споведзь мёртвай ракі / А. Масла // Блакітная кніга ў творах беларускіх пісьменнікаў / уклад. А. Масла. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2009. – С. 66-67.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова